# Зьніч

# Малітвы за Беларусь

Менск

Самвыдат

1989

Паважаны чытач,першы літаратурны дадатак да часопіса "Праваслаўная думка" ,прысьвечаны творчасьці вядомага беларускай інтэлігенцыі аўтара Зьніча.

Ен даволі шырока друкуецца ў эмігранскай прэсе,меней --у савецкай. Дзьве першыя кнігі /адна выдадзена ў Лондане,другая ў выдавецтве "Беларус"Ў Нью-Ерку/ былі прыхільна успрыняты замежнай крытыкай і каштавалі аўтару звальненьнем з працы ў інстытуце АН БССР.

Паэзія Зьніча нараджалася ў гады жорсткай дыктатуры, калі першая хваля пасьлясталінскага адраджэньня з А.Разакавым пайшла уніз,а другая--зА.Сысом,Глобусам,А.Аркушам,яшчэ не узьнялася.

Творчасьць Зьніча стаіць паасобку ў сучаснай беларускай паэзіі. Яна глыбока рэлігійна. І мо з'явіцца пачаткам адраджэньня веры ў беларускай інтэлігенцыі?

Калі так,вітаем Цябе,молімся,і жадаем посьпехаў.

рэдактар С т р а ц і л а т .

## На саборнай плошчы ў стольным Менску

мяне гукае сумная званіца...
мяне заве Адвечная Рака...
а перад Храмам--каб перахрысьціцца--
у мяне...не падымаецца рука!..

* * *

С,Крыўя,--не!..Цябе ня зморацьі..
Ты зноў асьвеньцішся знутры--
як па-крывіцку загавораць
з Табой Хрыстовы сьвятары!

...самотным прывідам сьвятару
ля канфармісцкіх пустыроў...
запальваю сьвятую мару--
стварыць Крывіцкіх сьвятароў!...

* * *

памілуй,Хрысьце,памілуй
нябожчыкаў і жывых...
І дай нам усім сьцяжыны
у бясконцых Шляхох Тваіх...



/з Н.К./

Жар сэрца даў сьвятло і цеплыню.
Сышла пара паліць,прышла--гаіць.
Усьвеце сьмерці й чорнага агню
Хрыстову сьвечку мушу запаліць.

Ня трэба цудаў. Цуды--быццам сны.
"Гаі,ратуй!"--то шэпча мне Зямля.
І мроіцца крывавая ральля:
Свой Крыж данёс да скону Божы Сын.

Натоўп шалее,шэры і тупы,
бязьлітасны,плюе Яму у Твар,
і прагне сутаргаў Таго,Хто Божы дар
Жыцьця прынёс у тлумныя скляпы.

О,Божа! я да ног Тваіх тулю
асьмяглы шэпт навек зьнямелых слоў.
Што творыце! Гэта ж--в а ш а Плоць і Кроў!
(Што-ж губіце Зямлю! Нябогі!)

## Кант

..штодня гардыню розуму разворвае
у ральлю Сумоўя летуценьнік кволы...
...цнатліва ўглядаюцца Анёлы
у бездань сэрца і бяздоньне зорнае...

* * *

...калі ў "век НТР" сьцісьне сэрца маё
сцыеньцізмам вучоная зграя,
заіскрыцца яно,бы' расою,крывёй:
Хрысьце мой,яЦябе кахаю...

калі бэсны прагмацік--за здраду Яму--
краты срэбныя паабяцае,
адкажу я--і праз залатую турму:
Хрысьце мой,я Цябе кахаю...

калі мне давядуць:Эвангельлі--мана...
і зямная царква -- не сьвятая...--
я ізноў паўтару:адыдзі,сатана,
Хрысьце мой,я Цябе кахаю...

...холад мёртвы з прадоньня:
Я г о -- н е б ы л о ...
Лік Нявіньніцы ў Небе згасае...
...запалю Таямніцы Апошняй сьвятло:
Хрысьце мой,на Крыжы--ў в а с к р а с а ю !..

## Ядтульны час ці
## Вечнае цяпер

сустрэне за м я ж о й Хрыстос адзіны
душу пакутную,што ўздымецца ў блакіт,
з сабою узяўшы зорныя хвіліны...
...а тлумны час--адыдзе ў Нябыт...

## Ноч ля ўзарванага храма
## Хрыста Спасіцеля

...таго злачынства адгалоскі--
адчаю поўныя равы:
магілы Волгі...рускай вёскі...
і белакаменнай Масквы...

шчыруе д'яблава навала...
і усё ж Расію--не сьсячы:
Ты--Праваслаўе захавала...
і Дух Твой--сьвеціцца ўначы!..

* * *

ня слухаюць словы...учынкі--ня чуюць...
з сутоньня--адчай--да сьвітаньня...
начамі--малюся...пад сонцам--начую...:
засвойваю
М о в у м а ў ч а н ь н я ...

* * *

О,Хрысьце,Ты спрадвечнае жніво
ад-дольных душ сярпом праменным праўдзіш:
наш час і лёс,сьляпы адчай і радасьць,
і зло,і сьвятасьць--рушаць да яго...



## На скон народа

Матывы Лермантава і Айтматава.

Манкуртам стаў нявольнік лёсу.
Маўчыць.Сыноў не пазнае.
Ні болю ўжо,ні прагі помсты:
чароўны круг на галаве...
Манкурт!..навошта галашэньне
і мітусьня--пасьля пакут?..
Ня будзе т у т уваскрашэньня--
адбыўся цэсараў прысуд.

...Згарэў вянок вякоў...Цяпер вянцом цярновым,
абвітым лаўрамі,заціснулі чало...
І змоўкла спадчыннае Слова...
І згасла Боскае Сьвятло...

А цар спатоліўся крывёю.
Дае палёгку нездарма:
шляхотны дух над той зямлёю
сканаў.Ратунку ўжо няма...
І што за дзіва?..адусюды
на лоўлю шчасьця і чыноў
шыбуюць процьмы ўцекачоў--
і Герастраты, і Іуды...
Гвалтуюць д'яблавы сыны
чужыя звычаі і мову...
Затое уласныя чыны
уладкавалі адмыслова!..
Скрышылі Храмы і Муры--
што ім усім да нашай славы!..
...на мерцьвяках--пасьля аблавы--
свой пір,ганебны і крывавы,
спраўляюць каты й гандляры!..

А вы,тутэйшыя Дантэсы,
падпанкі подласьці нахрапістых братоў,
Сьвятыню-спадчыну ў пракруставыя "крэсы"
за срэбнік кідаеце колькі ўжо вякоў?..
натоўпам сквапным раскашуеце ля тронаў,
на вочы матчынныя селі,
крумкачы...
схаваліся за шыльдамі законаў,
і суд,і праўда перад вамі--усё маўчы!..
Але ёсьць Божы Суд,наперсьнікі распусты!
Т а м ажыве закатаваны Край...
Нямы народ свае раскрые вусны--
і здасца вам:
"О,Божа!Пакарай!.."

...Усё узновіцца,што той абруч чарсўны
сьцёр з памяці,зь зямлі,з душы...
І кожны--уваскрашальнае пакуты поўны--
мо ўчуе:
"...Йдзі...
і болей не грашы..."

(Зь Лермантава)

Ад той пары, як я набыў
Вышэйшай воляй дар прарочы,
старонкі злосьці і жуды
адкрылі мне людскія вочы...

я нёс усім сваю любоў
і праўды чыстыя вучэньні:
у мяне й бліжэйшыя з братоў
шалёна кідалі каменьні...

пасыпаў попелам чало,
пайшоў ад іх з кійком жабрачым...
і вось--пустэльнае жытло...
жыву, як птушка,--Божым харчам...

мне ціха ў вочы зазірне,
з даверам, кожная істотка...
і зоркі слухаюць мяне,
мігцяць лагодна і дрыготка...

калі ж, праз тлумы й кірмашы,
бывае соваюся у сьпешцы,
гавораць дзецям, ад душы,
старыя--у ветлівай усьмешцы:

"Глядзіце: прыклад для ўсіх вас,
ён--ганарлівы, н а м варожы!
Дурны, хацеў упэўніць нас,
штоў ім гаворыць Голас Божы!

Не адступае ад свайго,
жыве пануры і балесны...
І кожны з нас--разумны й чэсны...
з пагардай плюне на яго!"

* * *

Няўжо, Крыўя, ты зноўку паганская?..
няўжо спляжыўся слынны народ?..
Твая шляхта ж была Хрысьціянскаю
амаль цэлую тысячу год!..

* * *

цябе ў Неба--нібы немаўлятку,
што ня можа й ня хоча ісьці,--
панясе закаханая шляхта...
...толькі д з е тую шляхту
знайсьці?..



Роўнаапостальны Ўладзімір
праз люстру тысячы гадоў,
глядзіць на сумны твар Радзімы,
на лёс асьлепленых сыноў.

У вогнішчах і хмарах дыму
ад кніг сьвятых і мейсц сьвятых
схавалі ад с ь в я т ы х -- Радзіму,
зрабілі з нас--натоўп сьляпых.

Люцыпра ад душы адыме
і паспаліты, і паэт--
калі ц я п е р вярнуць Радзіме
с ь в я т ы х , Владыко Філарэт!

* * *

У час апошняе высновы,
дзе Скон глядзіць на нас штодня,
няўжо ня ўславіць наша мова
Сьвятое Божае Імя?

У час сусьветнага садому,
што вар'яцее ад спакус,
блюзьнерыць танна несьвядомы,
маўчыць сьвядомы беларус.

Я буду ў роспачы і ў скрусе,
пакуль ня спраўдзіць гэты сьвет
саюз Царквы і Беларусі--
п р а з н а с ,
Владыко Філарэт!

* * *

Самаўпэўнены і сыты,
я ў застойныя гады
крытыкаваў Мітрапаліта,
"Царкву--бяз мовы і сьвятых..."

Владыко зрушыў цень маркотны:
Дух Дзядоў--Храмам стаў сьвяціць...
Але тутэйшы "люд шляхотны",
як і раней, панылa сьпіць...

Ваш кволы дух Радзіму зморыць,
народ наш зганіць на ўвесь сьвет...
за Вас сьятую справу творыць
шляхотны р у с к і --
Філарэт!

Вякі плывуць,
а Ён--
раскрыжаваны,
жывы...
ў крыві цячэ
цьвікоў іржа...
і род людзкі
нячыстым
апантаны
ня мае сілы
зьняць Яго
з крыжа...

* * *

чорна-белыя плыні Быцьця
я кранаю пальцамі лёсу...
мне бел-чырвона-белы сьцяг
адгукаецца бацькам хросным...

* * *

...Верай...Надзеяй...Каханьнем
Тройца таемна мігціць...
тое,што трацім сьвітаньнем,
мусім сутоньнем набыць...

* * *

...з россыпу слоў-крышталю,
прэлюдыяй і высновай,
промнем Хрыстовай хвалі
блісьне
Боскае
Слова...



Рэдактар С т р а ц і л а т .

Мастак Кастусь Якаў.

Літаратурны дадатак да часопіса праваслаўнае моладзі "Праваслаўная думка".

Часопіс "Праваслаўная думка" не з'яўляецца органам афіцыйных царкоўных уладаў і адлюстроўвае думку незалежнае рэдакцыі.

Бясплатна. Нумар выдадзены коштам рэдактара.

Наклад 1о ооо асобнікаў.

Ахвяруйце грошы ў фонд выданьня!